Магія лічбы. Пра што раскажа выстаўка «100 рарытэтаў»?

30.05.2022 15:51 | **Аўтар:** Алена Дзядзюля **Фота:** Яўген Пясецкі | Культура

Каб адчуць гісторыю, варта зазірнуць у кнігу — неабавязкова прачытаць, ужо шмат пра што скажуць вокладка, шрыфты, афармленне, месца і час выдання. У гэтым можна пераканацца на выстаўцы «100 рарытэтаў: ад гістарычных кнігазбораў да сучасных арткніг», якая адкрылася ў музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Выстаўка з'яўляецца своеасаблівым падвядзеннем вынікаў працы некалькіх пакаленняў бібліятэкараў на працягу ста гадоў існавання ўстановы. Яна дэманструе найбольш значныя і каштоўныя ўзоры сусветнай і беларускай кніжнай спадчыны.

Фонды пачалі фарміравацца адначасова з заснаваннем бібліятэкі ў 1922 годзе. У іх увайшлі калекцыі былых магнацкіх і шляхецкіх бібліятэк, зборы розных устаноў, прыватныя бібліятэкі вядомых дзеячаў культуры, мастацтва і навукі.

На
11:10
вобл
Бела
11:04
у раб
11:01
Бела
матч
10:49
забар
10:32
аб ра
Інш
У НБ
трады
Пра
граф
захаі
Самы
Бела
Цікав
памя
туры
Якія
—202
веда

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў бібліятэцы захоўвалася каля 2 мільёнаў экзэмпляраў дакументаў. У 1945 годзе засталося толькі 320 тысяч. Каля 700 тысяч выданняў удалося вярнуць у фонд бібліятэкі, але адзін мільён знік незваротна, і гэта былі самыя каштоўныя кнігі.

І тым не менш пасля вайны ўстанова актыўна разгарнула працу па зборы кніжных скарбаў. Сёння ў фондзе галоўнай бібліятэкі краіны ўжо больш за 10 мільёнаў дакументаў. Асаблівы гонар — рукапісныя і друкаваных кнігі, пачынаючы з XV стагоддзя. Бібліятэка мае калекцыю выданняў беларускага першадрукара Францыска Скарыны.

100 РАРЫТЭТАЎ
да юбілею Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі
ЗВЯЗДА

На выставе можна пабачыць унікальныя малавядомыя рукапісы XV—XIX стагоддзяў. Сярод якіх «Пролаг. Вераснёўская палова», пастановы і дэкрэты Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага, каралеўскія прывілеі і граматы, выпіскі з Архіва Мінскага гарадскога суда другой паловы XVI стагоддзя, «Шастаднец» (XVII стагоддзе). Прадстаўлены кнігі першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі Брэсцкай друкарні Мікалая Радзівіла Чорнага, старадрукі, якія выйшлі ў Гродне, Магілёве, Куцейне, Полацку, Мінску, Нясвіжы.

Бібліятэка захоўвае выданні знакамітага беларускага ваеннага інжынера, тэарэтыка артылерыі Казіміра Семяновіча. Яго першая кніга ўбачыла свет у 1650 годзе, а пасля была перавыдадзена на французскай, нямецкай і англійскіх мовах.

Выстаўка ламае стэрэатып шэраговага чытача наконт таго, што ў нашай краіне мала што захавалася з рарытэтаў. Насамрэч у галоўнай кніжнай скарбніцы знаходзіцца багата цікавостак для даследчыкаў. У экспазіцыі пададзены кнігі, створаныя на розных матэрыялах, у тым ліку гліняных таблічках, пальмавых лістах, пергаменце, у форме скрутка ці кодэкса. Прадстаўлены потхі, інкунабулы, палеатыпы, якія паказваюць, як на працягу стагоддзяў змянялася кніга.

На выстаўцы можна пабачыць 25 метровую тору (наогул калекцыя тор Нацыяналкі каля 30 адзінак). Прадстаўлены тут і кнігі беларускіх татар. Для даследчыкаў гэта цікавая крыніца інфармацыі: арабскай графікай перададзены беларуска-літоўскія і беларуска-польскія тэксты. Да гэтага часу мы не ведаем, як у XIV—XVI стагоддзях гучала наша мова, але дзякуючы арабаграфічным рукапісам, у якіх складаная сістэма таніравання, можна атрымаць аб тым уяўленне.

У канцы XVII стагоддзя на нашай тэрыторыі з'яўляюцца стараабрадцы. У Нацыянальнай бібліятэцы захоўваецца вялікая калекцыя рукапісаў, з імі звязаных. Нават быў выпрацаваны асобны, веткаўскі, стыль афармлення кніг. Часам на беларускай тэрыторыі (да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай) друкаваліся кнігі для расійскіх старавераў. Калі ў самой Расіі стараабрадчая літаратура лічылася забароненай, то падобная прадукцыя з выхаднымі звесткамі з Гродна ці Магілёва лічылася проста замежнымі выданнямі. Першая кніга для стараабрадцаў была надрукавана ў Магілёве ў 1705 годзе па заказе калужскіх купцоў.

У экспазіцыі прадстаўлены цікавыя экзэмпляры з калекцыі ўсходніх рукапісаў, пачынаючы з XV стагоддзя. Кнігі аздабляліся ўзорамі, зробленымі з золата. Калекцыя інкунабулаў бібліятэкі — самая вялікая ў рэспубліцы, гэтак жа як і калекцыя палеатыпаў (каля 200 выданняў). Апошнія паказваюць, як з 1501 па 1550 год здзяйсняўся пераход да новага друку — у кнігах ужо з'яўляўся тытульны ліст і выхадныя даныя. У Нацыянальнай бібліятэцы захоўваецца з дзясятак прыжыццёвых выданняў Мартына Лютара, некаторых з іх можна пабачыць на выстаўцы ў Музеі кнігі.

Як выглядалі старажытныя рукапісы?
How did ancient manuscripts look like?
МУЗЕЙ КНІГІ
MUSEUM OF BOOK
100 РАРЫТЭТАЎ

У XVIII стагодзі ў кніжную вытворчасць вяртаюцца мастакі, якія ў XVII стагоддзі ад яе адышлі. Тое, якія шыкоўныя майстры чаравалі над афармленнем выданняў, выдатна дэманструюць французскія кнігі таго часу.

Вельмі рэдкімі лічацца кнігі Пятроўскай эпохі. Тады вырас попыт на веды, значна павялічылася колькасць свецкіх кніг. Вось толькі запатрабаваная вучэбная літаратура захоўвалася дрэнна...

Рукапісныя кнігі працягваюць стварацца і ў наш час. Праўда, сёння гэта хутчэй арт-аб'екты — сярод такіх экспанатаў выстаўкі «скапіраваная» мастаком Скарынаўская біблія і



КЛІНАПІСНАЯ ТАБЛІЧКА.
Копія.
ЗВЯЗДА

«Песня пра зубра» з ілюстрацыямі Юрыя Якавенкі. Маецца ва ўстанове і даволі вялікая калекцыя архіўных дакументаў. У фонды людзі перадаюць каштоўныя крыніцы, дораць старыя фатаграфіі (дарэчы, тут ужо назапасілася багата фотакартак пачатку XX ст.).

Выстаўка дае падказкі пра тое, якія каштоўнасці схаваныя ў яе фондах. Многія кнігі яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў. Дарэчы, яна будзе працаваць да канца 2022 года.

СУНЬ ЦЗЫ.
МАСТАЦТВА ВАЙНЫ. XX ст.
Бамбукавы скрутак.
ЗВЯЗДА

МЯЗУЗА. XIX ст.
Рукапісны скрутак на пергаменце. Іўрыт

ЗВЯЗДА

АРХАНГЕЛЬСКОЕ ЕВАНГЕЛИЕ 1092 ГОДА.
Москва, 1912
Факсімільнае выданне.

ЗВЯЗДА



ПЕРШЫ "БУКВАР": ДА 400-ГОДДЗЯ ВЫДАННЯ. МІНСК, 2018

Факсімільнае ўзнаўленне Буквара, выдадзенага
Еўе ў 1618 г. Камплект з трох кніг у драўляны



ПАСТАНОВЫ ТРЫБУНАЛА ВКЛ, КАРАЛЕЎСКІЯ ПРЫВІЛЕІ І ГРАМАТЫ, ВЫПІСЫ З АРХІВА МІНСКАГА СУДА ГАРАДСКОГА, ЛІСТЫ ПРЫВАТНЫХ АСОБ. 1558, 1569, 1582, 1591-1597 гг.

Старабеларуская мова, скарапіс.



МОДНОЕ ИЗДАНІЕ

ДЛЯ

ДАМСКАГО ТУАЛЕТА.

XVIII.

ИРОИДА.

Мелангръ къ Лицедѣ.

Часть II. Мѣс. Май. Б

ЗВЯЗДА

ЗВЯЗДА

СТАРАЖЫТНЫЯ, РЭДКІЯ І НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПОМНІКІ
КНІЖНАЙ КУЛЬТУРЫ З ФОНДАЎ БІБЛІЯТЭКІ
26 МАЯ 2022–31 СНЕЖНЯ 2022
ЗВЯЗДА

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА